**327.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы асноўную думку тэксту.

Адзін з самых каларытных рэгіёнаў Беларусі — Чэрвеньскі раён.

Чэрвень — радзіма касманаўта Алега Навіцкага, які 4 разы пабываў на Міжнароднай касмічнай станцыі. У гарадской школе № 2, дзе ён вучыўся, арганізаваны музей касманаўтыкі.

У 1819 годзе ў вёсцы Убель нарадзіўся кампазітар і дырыжор Станіслаў Манюшка. А восеньскімі днямі 2017 года ў Смілавічах адкрылася музычная гасцёўня імя вялікага кампазітара. Тут праводзяцца творчыя вечарыны[сл], у якіх прымаюць удзел выхаванцы дзіцячых мастацкіх школ раёна.

У Смілавічах дзейнічае адзінае ў краіне прадпрыемства па вырабе валёнак. Слава пра смілавіцкія валёнкі ходзіць па ўсім свеце *(Паводле А. Навахроста)*.

***рэгіён***

Выпішыце з тэксту прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфікса ***-ск-***. Растлумачце іх правапіс.

Вызначце тып тэксту. Якая кампазіцыйная частка ў ім прапушчана? Дапоўніце тэкст гэтай часткай. Запішыце яе.

Раскажыце пра тое, якімі людзьмі, прадпрыемствамі, мясцінамі славіцца ваша малая радзіма. Уявіце, што вам прапанавалі прыняць удзел у фотаконкурсе «Вялікія справы маёй малой радзімы». Які фотаздымак вы зрабілі б? Вусна апішыце яго.

## § 52. Правапіс *-н-*, *-нн-* у прыметніках

**328.** Разгледзьце схему. Якім спосабам утвораны прыметнікі *лімонны, раённы, туманны*?

*лімон* / *раён* / *туман* + *-н-* = *лімонны* / *раённы* / *туманны*

На які гук заканчваюцца асновы назоўнікаў, ад якіх утвораны прыметнікі *лімонны*, *раённы*, *туманны*?

Абапіраючыся на схему, сфармулюйце правіла правапісу ***-нн-*** у прыметніках.

**!**

Дзве літары ***нн*** пішуцца ў прыметніках, якія ўтвораны:

- ад назоўнікаў з асновай на ***н*** пры дапамозе суфікса ***-н-***: *камень — каме́нны, акно — аконны*;
- ад назоўнікаў на ***-мя*** пры дапамозе суфікса ***-янн-***: *племя — пляменны, цемя — цемянны* (**але:** *полымя — палымяны*);
- пры дапамозе суфіксаў ***-енн-, -энн-***: *абед — абедзенны, страх — страшэнны*.

З адной літарай ***н*** пішуцца прыметнікі, утвораныя пры дапамозе суфіксаў ***-н-, -ан-, -ян-, -ін-, -ын-***: *хата — хатні, люстра — люстраны, гліна — гліняны, ліса — лісіны, шпак — шпачыны*.

**329.** З дапамогай суфіксаў ***-н-, -ян-, -ын-*** утварыце ад назоўнікаў прыметнікі. Запішыце.

Конь, цэгла, дзень, салома, птушка, лёд, сон, звер, полымя.

З двума прыметнікамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

**330.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю ён належыць?

Соня прыехала на лецішча*. Добра тут! Драўлян..ая хата пафарбавана ў лімон..ы колер. Здаецца, усё лецішча заліта промнямі вясен..яга сонца.

За новен..кай хатай ра..кінуўся ябл..невы сад. На дрэвах, сагрэтых красаві..кім со..нцам, ужо выпрасталіся зялёнен..кія лісточкі. На тоўстай галіне высачэн..ай ябл..ні вісяць Сонін..ы арэлі.

За садам — агарод. На ім зроблены роўнен..кія градкі. Адна — зусім мален..кая. Соня здагадалася: «Гэта ж мая!»

Пасля абеду дз..ўчынка разам з бабуляй пасадзілі радыску. Спачатку яны зрабілі ўздоўж мален..кай градкі баразёнку. Туды Соня паклала дробнен..кае насен..е і асц..рожна зараўняла з..млю далон..камі. Потым акуратна ра..грэбла з..млю граблямі і паліла калодзежн..ай в..дой.

Ц..пер у Соні з'явіўся новы клопат. Кожную раніцу, перш чым пабе..чы гуляць, яна ішла пагл..дзець на сваю градку *(Паводле Т. Бунта)*.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Вусна пракаменціруйце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

Размясціце пункты плана тэксту ў правільнай паслядоўнасці.

П л а н

1. Соніна градка.
2. Прыезд на лецішча.
3. Новы клопат.
4. Пасадка радыскі.
5. Яблыневы сад.

Спішыце частку тэксту, якая адпавядае пункту плана «Яблыневы сад». Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс суфіксаў прыметнікаў.

**331.** Размяркуйце прыметнікі па групах у залежнасці ад таго, якому правілу падпарадкоўваецца іх правапіс. Запішыце.

Чысценькі, задуменны, снежаньскі, вузенькі, выдавецкі, здаравенны, восеньскі, вогненны, баранавіцкі, светленькі, юнацкі.

Сфармулюйце правіла правапісу прыметнікаў кожнай групы.

**332.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Правапіс ***-н-, -нн-*** у прыметніках».

## § 53. Складаны план

План тэксту можа быць як простым, так і складаным. У складаным плане асобныя пункты маюць падпункты. Гэта адбываецца, калі ў тэксце выдзяляюць вялікую частку, якая ўключае некалькі малых частак.

Пункты складанага плана, як і простага, могуць мець форму словазлучэнняў, кароткіх апавядальных або пытальных сказаў.

**333.** Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнс загалоўка.

### Пазнаёміліся

У кожнага быў свой занятак. Жанчына з маленькім сынам акучвала бульбу. А шпачыха збірала побач чарвякоў і насіла іх пісклявым птушанятам.